УДК 902/904

**А. Д. Гаршкоў**
*Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы», Гродна*

# КАМЕННАЯ СВІДРАВАНАЯ СЯКЕРА З ВЁСКІ ПЕРСТУНЬ ГРОДЗЕНСКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Уводзіны.** У 2013 годзе каля в. Перстунь Падлабенскага сельскага савета Гродзенскага раёна (рысунак 1) была знойдзена каменная свідраваная сякера (далей — КСС). Праз два гады (2015) В. Пуцілоўскі перадаў артэфакт на захаванне у музей «Хрысціянскія каштоўнасці і народныя традыцыі у сям'і», які размяшчаецца на базе ДУА «Сярэдняй школы № 38 г. Гродна».




Рысунак 1 — Карта месцазнаходжання каменнай свідраванай сякеры

Для апісання КСС аўтарамі выкарыстоўвалася сістэма, распрацаваная С. Б. Ліневічам і В. Л. Лакізай [1]. Выказваем падзяку С. Б. Ліневічу за дапамогу ў вызначэнні асаблівасцей даследумай КСС.

**Асноўная частка.** Сякера зроблена з каменя светла-шэрага колеру. Артэфакт мае невялікія сколы ў лёзавай часцы. Паверхня добра зашліфавана, але з аднаго боку шліфоўка насіла толькі частковы характар. Грані несіметрычныя, вастрыё дугападобнае, абушок сплошчаны, прамавугольны з выпуклымі гранямі. Свідравіна конусападобная: $\emptyset_1$ — 3,1 см, $\emptyset_2$ — 2,7 см. Сячэнне прамавугольнае з трымя выпуклымі гранямі, аснова сячэння сякеры мае увагнутую форму з ледзь выступаючым лязом. Даўжыня — 19,2 см, шырыня на ўзроўні свідравіны — 9,1 см, шырыня абушка — 4,8 см, вышыня вырабу на ўзроўні свідравіны — 4,7 см, вышыня на ўзроўні ляза — 5,4 см (рысунак 2).

Згодна класіфікацыі А. Я. Брусава, М. П. Зімінай [2, с. 24—25, 73], па абрысам (en face) КСС можна аднесці да тыпу абушковых сякер, аднак, зыходзячы з формы абушковай часткі, сякера блізкая да ромбападобных. Калі выкарыстоўваць тыпалогію Д. Я. Крайнова, то артэфакт можна аднесці да каротка-абушковых сякер [3, с. 42—43], але вышэй апісаныя асаблівасці набліжаюць яе да ўсечана-канічных [3, с. 48]. Згодна класіфікацыі, распрацаванай В. Л. Лакізай для тэрыторыі Панямоння, сякера адносіцца да тыпу 3б [4, с. 125], але па форме абушковай часткі блізкая да тыпу 1в [4, с. 125—126]. Згодна з Рымантэ, адносіцца да КСС з завужаным абушком [5, с. 233].

Варта адзначыць, што, улічваючы спецыфіку даследуемага аб'екта, аднясенне да пэўных тыпаў даволі ўмоўнае. Шэраг знешніх прыкмет КСС адрозніваецца ад уласцівых вышэйназваным тыпам. Напрыклад, форма абушковай часткі (яна набліжаная да КСС тыпу 1в, паводле Лакізы), сячэнне (адна грань увагнутая), буйны памер.

Так, КСС з адзначанымі параметрамі сустракаюцца даволі рэдка на тэрыторыі Беларусі. Хутчэй за ўсё гэтая сякера несла сакральнае прызначэнне. Аб гэтым сведчаць памеры вырабу і адносна маленькі дыяметр свідравання, якога будзе недастаткова для добрага замацавання рукаяткі.

© Гаршкоў А. Д., 2017

Репозиторий БарГУ




Рысунак 2 — Каменная свідраваная сякера, знойдзеная
каля в. Перстунь (Гродзенскі раён)

Традыцыйна КСС выкарыстоўваліся ў якасці зброі і статуснага элемента насельніцтвам эпохі неаліта-бронзы, як сакральная рэч, ёй надавалі гаспадарчае прызначэнне ў больш пазнейшыя часы [5]. Згодна дадзеных пахавальных комплексаў КСС выступаюць спадарожнікамі мужчынскіх пахаванняў на тэрыторыі ад Уральскіх гор да Скандынавіі [3, с. 38—39; 6, с. 82—83]. У Беларусі пахаванні з КСС былі выяўлены на тэрыторыі Падняпроўя і Панямоння [7; 8].

**Заключэнне.** Звычайна дамінуючая колькасць знаходак КСС не мае дакладнай лакалізацыі на мясцовасці. Каштоўнасць знаходкі сякеры каля в. Перстунь заключаецца ў яе дакладнай геаграфічнай прывязцы, што дазваляе меркаваць аб наяўнасці ў ваколіцах вёскі зруйнаваных пахаванняў эпохі бронзы.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Лакіза, В. Л.* Каменныя свідраваныя сякеры з фондаў Ашмянскага краязнаўчага музея / В. Л. Лакіза, С. Б. Ліневіч // Ашмяншчына: праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі : зб. навук. арт. — Мінск : Беларус. навука, 2011. — С. 18—23.
2. *Брюсов, А. Я.* Каменные сверленые боевые топоры на территории европейской части СССР / А. Я. Брюсов, М. П. Зимина. — М. : Наука, 1966. — 173 с.
3. *Крайнов, Д. А.* Древнейшая история Волго-Окского междуречья (Фатьяновская культура II тыс. до н.э.) / Д. А. Крайнов. — М., 1972. — 201 с.
4. *Лакіза, В. Л.* Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза. — Мінск, 2008. — 184 с.
5. *Rimantien, R.* Lietuvos TSR archeologijos atlasas / R. Rimantien, E. Grigalaviien, O. Baguien. — Vilnius, 1974. — Kn. 1. Akmens iralvario amiaus paminklai. — 173 s.
6. *Артеменко, И. И.* Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы / И. И. Артеменко. — М., 1960 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 148).
7. *Лакіза, В. Л.* Пархуты 1 — новы помнік неаліту і бронзавага веку на Шчары / В. Л. Лакіза // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі Акад. навук Беларусі ; уклад. М. М. Чарняўскі, А. М. Мядзведзеў. — Мінск, 1999. — № 14. — С. 104—124.
8. *Крывальцэвіч, М. М.* Курган сярэднедняпроўскай культуры на возеры Камарын каля Рагачова / М. М. Крывальцэвіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск, 2004. — № 19. — С. 34—57.


Репозиторий БарГУ